# Выконваючы інтэрнацыянальны абавязак

57 слаўгарадскіх юнакоў прайшлі праз Афганістан за час знаходжання там савецкіх войскаў у 1979—1989 гг. Дзесяць з іх вярнуліся з урадавымі ўзнагародамі: сяржант Уладзімір Фёдаравіч Куляшоў — з ордэнам Чырвонай Зоркі; старшы сяржант Мікалай Міхайлавіч Давыдзенка, радавыя Сяргей Міхайлавіч Антонаў, Сяргей Міхайлавіч Дзеружынскі, Анатоль Міхайлавіч Саўчанка — з медалём «За адвагу»; сяржанты Уладзімір Віктаравіч Бычыкаў, Уладзімір Мікалаевіч Стральцоў, Васіль Васільевіч Сяргеенка, радавыя Мікалай Васільевіч Луфераў, Сяргей Аркадзевіч Мельнікаў — з медалём «За баявыя заслугі». Двое вярнуліся на Радзіму ў цынкавых трунах.



М.Б.Зліпушэнка.



Г.А.Студнеў.

**ЗЛІПУШЭНКА Мікалай Барысавіч.** Нарадзіўся 29.8.1953 г. у пас. Зялёны Бор Смалявіцкага раёна. Беларус. У 1968 г. скончыў Азарыцкую васьмігадовую школу, у 1970 г. — магілёўскае ПТВ № 54. Працаваў слесарам у Мінску. У лістападзе 1971 г. прызваны ў Савецкую Армію Мінскім РВК. Пасля тэрміновай службы звязаў свой лёс з арміяй. У 1973 г. скончыў школу прапаршчыкаў. У 1983 г. накіраваны ў Афганістан. Прапаршчык М.Б.Зліпушэнка загінуў 14.4.1984 г. Пахаваны ў в. Азарычы Слаўгарадскага раёна. Узнагароджаны медалём «За баявыя заслугі».

### З пісьма сябра М.Б.Злінушэнкі яго маці

Здравствуйте, дорогая, уважаемая Колина мама!

Простите меня за то, что я не могу обратиться к Вам по имени и отчеству, так как Вы не написали его мне в своем письме. Простите меня, ради Бога, что я по своему незнанию растревожил Ваши незаживающие раны. Письмо мое преследовало одну цель — найти моего лучшего друга Николая. Не успел я его найти и обнять. И мне очень горько и обидно, что в 31 год, когда жизнь только начинается, у Николая она кончилась.

Дорогая Колина мама, я знаю, что Вам очень тяжело будет читать мое письмо. Но Вы не плачьте, прошу Вас, прошу как свою маму.

Я хочу сказать Вам, что Николай, Ваш сын, был настоящим парнем, не любил прятаться за спины товарищей, знал цену дружбы. И мы, его друзья, а их у Коли было много, всегда сохраним память о нашем товарище и друге.

С Николаем мы призывались из одного военкомата Минска. Вместе попали служить в Монголию. Срочную службу проходили в одном взводе, и кровати в казарме стояли наши рядом. По окончании школы прапорщиков вернулись обратно в нашу часть и служили вместе до 1978 года. Проходя службу в Монголии, мы жили с Николаем в одной комнате общежития. Потом я женился. Коля тоже женился. У меня родилась дочь Наташа, и у Николая тоже родилась девочка. Моя жена и Колина жена, Лариса, дружили. И вот в 1978 году Николай заменился в Киевский военный округ, а я — в Белорусский военный округ. И так сложилась судьба, что мы потеряли связь друг с другом. Он заменился раньше меня и, наверное, написал в Монголию, но его письмо уже не застало меня там, я уехал к новому месту службы.

Пишу Вам письмо и не верится, что Колюшки нет. Я выберу время и приеду поклониться могиле моего дорогого друга, приеду на свидание — запоздалое свидание, и пусть простит меня Николай за запоздалую встречу...

Низко Вам кланяюсь, желаю здоровья! Вы вырастили настоящего человека, и мы будем помнить о нем. Пишите, будем ждать писем от Вас.

С уважением, семья Шупта В.М.

**СТУДНЕЎ Генадзь Анатольевіч.** Нарадзіўся 21.11.1962 г. у в. Сычын Слаўгарадскага раёна. Беларус. У 1977 г. скончыў Сычынскую васьмігадовую школу, у 1979 г. —



У час наведвання раёна дэлегацыяй г. Мантэваркі. Італьянскія госці і іх калегі з райвыканкома каля помніка Герою Савецкага Саюза П.Ц.Панамарову. У цэнтры — намеснік мэра Мантэваркі Дж.Манікаліні, справа намеснік старшыні Слаўгарадскага райвыканкома М.С.Міроненка.

крычаўскае ПТВ № 112. Працаваў слесарам у саўгасе «Памяць Фрунзе». У сакавіку 1981 г. прызваны ў Савецкую Армію Слаўгарадскім РВК. Служыў у Афганістане. Яфрэйтар Г.А.Студнеў загінуў 14.12.1982 г. Пахаваны ў в. Сычын. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі (пасмяротна) і медалём «За баявыя заслугі».

**З пісьма Г.А.Студнева родным**

2 верасня 1981 г.

... Как там у вас? Наверное, скоро бульбу начнете копать. Были селета боровики или нет или они еще не начали расти? Сегодня второй день занятий в школе. Как там Юрка, не хочет учиться, ленится, наверное? Как там Леня, Валя, Лена? Тетка попрежнему телят смотрит или нет? Валя Горбачева дома живет или у бабки в Лопатичах? Сейчас у вас, наверное, хорошо, яблок много! Как там дед с бабкой поживают?.. Напишите все подробно... Знаешь, мать, другой раз как ляжешь, как начнешь вспоминать, так домой захочется, кажется, сбежал бы...

На этом буду кончать свое письмо. Новостей у меня нет, пишите вы свои новости.

До свидания. Гена.

## Міжнародным сувязям мацнець

У 1990-я гады характэрнай з’явай для Слаўгарадчыны стала развіццё і ўмацаванне міжнародных сувязей. Значную дапамогу ў вырашэнні гуманітарных праблем, будаўніцтве і абсталяванні аб’ектаў сацыяльнага прызначэння аказваюць дабрачынныя і грамадскія арганізацыі Германіі, Італіі.

З 1997 г. развіваюцца сувязі паміж райвыканкомам і мэрыяй італьянскага г. Мантэваркі. Адбыліся абмены дэлегацыямі, у перспектыве рэалізацыя некаторых праграм па лініі TASIS, дапамога італьянскіх калег у аздараўленні слаўгарадскіх дзяцей, абсталяванні медыцынскіх аб’ектаў і інш.